**А. А. Крыварот**

# ДЗЕЙНАСЦЬ ОРГАНАЎ КП(Б)Б, ПАРТЫЗАНСКАГА КАМАНДАВАННЯ ПА СТРЫМЛІВАННІ СТВАРЭННЯ І ФУНКЦЫЯНАВАННЯ СТРУКТУР АРМІІ КРАЁВАЙ НА ТЭРЫТОРЫІ БАРАНАВІЦКАЙ І ВІЛЕЙСКАЙ АБЛАСЦЕЙ (1942–1943)

Падпольнымі структурамі КП(б)Б і камандаваннем партызанскіх фарміраваняў, пачынаючы з другой паловы 1942 г., пастаянна збіраліся звесткі аб настроях сярод насельніцтва, у тым ліку палякаў, дзейнасці польскіх падпольных антысавецкіх структур на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі. Гэтая інфармацыя па розных каналах перадавалася ў ЦК КП(б)Б, ЦШПР і БШПР.

У сваёй дакладной запісцы на імя П. К. Панамарэнкі ад 6 кастрычніка 1942 г. І. М. Цімчук, у той час камісар партызанскага атрада «Мсціўца» на Лагойшчыне, выказаў думку, што «на данный момент важную роль сыграли бы специальные польские группы, переброшенные в западные области». Далей ён адзначыў наяўнасць там моцнага польскага нацыянальнага руху і незадаволенасці немцамі, а таксама адсутнасць сярод мясцовага польскага насельніцтва баявых важакоў. Згадваючы пра погляды і дзейнасць «польских националистов», Цімчук падкрэсліў, што яны вядуць толькі агітацыю, «это не наши друзья», якія не супраць, каб «мы освободили от немецкого ига», аднак яны за «помещичью Польшу». У дакладной запісцы прапанаваў, не чакаючы, разгортваць у заходніх абласцях бальшавісцкі рух па змесце і польскі па форме [1, л. 2аб].

Са зместу гутаркі ў савецкім тыле 27 кастрычніка 1942 г. з камандзірам атрада «Спартак» І. І. Пятровым, які прыбыў з Відзаўскага раёна Вілейскай вобласці, вынікала, што ў Аўгустоўскіх лясах знаходзіцца вялікая па колькасці група атрадаў польскай абароны, якія дзейнічаюць на тэрыторыі некаторых заходніх абласцей. У ліпені 1942 г. палякі адбівалі наступ немцаў і былі вымушаны адступіць, знішчыўшы пры гэтым шмат нападаўшых. І. І. Пятроў паведаміў аб кантактах кіраўніцтва атрада ў першай палове верасня 1942 г. з чатырма прадстаўнікамі, сярод якіх быў афіцэр, падраздзяленняў польскай абароны. Стала вядома, што палякі правялі некалькі аперацый супраць немцаў, у тым ліку ў Паставах. Галоўнай іх задачай было змаганне за незалежную Польшчу[2, л, 5аб–6].

Звесткі аб ваенна-палітычнай сітуацыі на акупаванай тэрыторыі заходніх абласцей дасылалі ў Цэнтр і шараговыя партызаны. У дакладной запісцы ў Мінскі абкам КП(б)Б ад 5 снежня 1942 г. байца брыгады «Дзядзькі Васі» Г. Д. Панамарова, які пэўны час знаходзіўся ў раёнах Баранавіцкай і Вілейскай абласцей, выказана яго бачанне настрояў насельніцтва польскай нацыянальнасці. Палякі чакаюць, што будзе «старая Польша», і за яе гатовы ў любы час паўстаць на барацьбу. Падкрэсліў, што ў палякаў ёсць падпольная арганізацыя, якая вядзе барацьбу супраць немцаў. У запісцы прыведзены асобныя вытрымкі з лістоўкі-зварота Віленскага цэнтра да польскага насельніцтва аб неабходнасці назапашваць сілы для ўдару, як толькі польскае войска ў Англіі і Савецкім Саюзе ўвойдуць на тэрыторыю Польшчы [1, л. 169].

Значнай інфармацыяй аб сітуацыі на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі валодаў І. Ф. Клімаў, які ў чэрвені–лістападзе 1942 г. быў сакратаром Мінскага, а са снежня 1942 г. да красавіка 1943 г. сакратаром Вілейскага абкамаў КП(б)Б. Напрыклад, непасрэдна яму была адрасавана запіска даваеннага старшыні Воранаўскага райпатрэбсаюза А. Д. Ловіна, накіраванага ў канцы 1942 г. у савецкі тыл з падраздзялення А. Д. Мядзведзева з месцам базіравання ў Докшыцкім раёне. Сувязны адзначыў, што польскае насельніцтва супраць немцаў, але чакае прыходу польскай арміі, заўсёды пыталася ў савецкіх партызан аб У. Сікорскім і польскай нацыянальнай арміі. У запісцы было падкрэслена, што палякі захоўваюць шмат зброі [1, л. 173].

Варта адзначыць, што летам – напачатку восені 1942 г. Мінскі абкам КП(б)Б знаходзіўся непадалёку ад Віцебскіх «варот» і І. Ф. Клімаў меў магчымасць непасрэдна гутарыць з партызанамі, якія ў якасці сувязных накіроўваліся ў савецкі тыл і валодалі каштоўнымі звесткамі адносна падзей на акупаванай тэрыторыі, у тым ліку ў заходніх абласцях.

Валоданне вялікім аб’ёмам інфармацыі аб сітуацыі ў тыле ворага дазволіла І. Ф. Клімаву 5 студзеня 1943 г. накіраваць данясенне першаму сакратару ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнку з высновамі наконт польскай праблемы. У дакуменце згадваецца аб існаванні ў некаторых мястэчках Свірскага, Пастаўскага, Браслаўскага раёнаў тайных польскіх арганізацый, а таксама Віленскага польскага падпольнага цэнтра, які знаходзіцца ў падпарадкаванні Лонданскага эмігранцкага ўрада. Месцам дыслакацыі польскіх падраздзяленняў абароны ўказваюцца Аўгустоўскія лясы, адкуль прыходзілі сувязныя ў партызанскія атрады Вілейскай вобласці пад камандаваннем Ф. Р. Маркава і І. І. Пятрова. Важнымі ў дакуменце з’яўляюцца наступныя звесткі. Па-першае, польскія падпольныя арганізацыі маюць разнастайную зброю, а ў іх склад уваходзяць афіцэры. Па-другое, у Вілейскай вобласці распаўсюджвалася пракламацыя Віленскага цэнтра з праграмай дзейнасці. Лістоўка заклікала палякаў назапашваць сілы і рыхтаваць удар, як толькі польскія войскі, якія знаходзяцца ў Лондане і Савецкім Саюзе, увойдуць на тэрыторыю Польшчы ці пачнуць наступ [1, л.146аб–147].

Зыходзячы з дакладаў партыйных работнікаў, каманднa-палітычнага складу з месцаў, П. К. Панамарэнка 20 студзеня 1943 г. накіраваў у ЦК УКП(б) дакладную запіску пад назвай «О поведении поляков и некоторых наших задачах», У дакуменце адзначалася, што неабходна ўлічваць заклікі польскага эмігранцкага ўрада і яго структур на месцах да палякаў аб неабходнасці ўстрымацца ад адкрытай узброенай барацьбы з немцамі да канчатковага этапу вайны, калі неабходна будзе падтрымаць дзейнасць саюзнікаў – Англіі і ЗША. Пры гэтым важна мець на ўвазе намаганні таго ж урада на тое, каб польскія сілы захоўваліся і арганізоўваліся супраць Савецкага Саюза. У сувязі з такой пазіцыяй польскага эмігранцкага ўрада П. К. Панамарэнка прапанаваў зрабіць некаторыя захады «по разжигании партизанской войны на территории Польшы», для чаго накіраваць туды 80–90 «подготовленных и обученных агентов» з ліку польскіх камуністаў [3, с. 38–39; 4, с. 249–250].

Важную ролю ва ўмацаванні партызанскага руху на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі і забеспячэнні перавагі савецкіх падпольных і партызанскіх структур над польскім падполлем адыгралі рашэнні V Пленума ЦК КП(б)Б (26–28 лютага 1943 г.). У пастанове пленума была падкрэслена важнасць «усиления работы в западных областях Беларуси в целях дальнейшего расширения партизанского движения и вовлечения в него широких масс трудящихся, а также в противовес ведущейся националистической обработке населения со стороны различных польских нелегальных организаций» [5, с. 50–52; 6, л. 136].

Варта адзначыць, што вышэйзгаданыя захады ЦК КП(б)Б і яго першага сакратара П. К. Панамарэнкі рабіліся ў рэчышчы паступовага пагаршэння адносін савецкага кіраўніцтва да польскага міграцыйнага ўрада ў Лондане. Першым знакавым штуршком да пагаршэння адносін паслужыў той факт, што армія У. Андэрса, сфарміраваная на тэрыторыі Савецкага Саюза з польскіх ваеннапалонных, адмовілася змагацца сумесна з Чырвонай арміяй на савецка-германскім фронце, і да 1 верасня 1942 г. была поўнасцю завершана эвакуацыя яе часцей на тэрыторыю Ірана. Па меркаванні беларускага гісторыка Г. Д. Кнацько, «эвакуация армии Андерса была поворотным пуктом в процессе формирования настроений польской эмиграции в СССР» [7, с. 6].

У пачатку 1943 г. адбылася гістарчная падзея на савецка-германскім фронце – у баях на Волзе была акружана, а затым разгромлена моцная групіроўка войск гітлераўскай Германіі і яе сатэлітаў. У сувязі са станоўчымі зменамі на фронце савецкім кіраўніцтвам быў узяты курс на паступовае згортванне адносін з польскім урадам У. Сікорскага і стварэнне на тэрыторыі СССР «новых польскіх улад» з ліку польскіх камуністаў [4, с. 250].

Масква вітала гуртаванне прасавецкі настроеных палякаў вакол часопіса «Новые горизонты», які аднавіў сваю дзейнасць яшчэ з 5 ліпеня 1942 г. у Куйбышаве (супадае па часе, калі адбывалася перамяшчэнне арміі У. Андэрса ў Іран). Быў падтрыманы зварот Ванды Васілеўскай у СНК СССР 4 студзеня 1943 г. ад імя рэдакцыі з праектам стварэння польскага дэмакра-

тычнага цэнтра. Вынікам такіх намаганняў В. Васілеўскай і яе паплечнікаў стала стварэнне Саюза польскіх патрыётаў (СПП) і выхад штотыднёвіка «Вольна Польска» («Свободная Польша»), які стаў тэарэтычным, палітычным і культурным органам СПП [7, с. 7].

Крытычныя наступствы для адносін савецкага кіраўніцтва і ўрада У. Сікорскага мела «Катынская справа», якая набыла шырокі рэзананс у красавіку 1943 г., калі эміграцыйны ўрад звярнуўся ў Міжнародны камітэтэт Чырвонага Крыжа з просьбай аб расследаванні гэтай сітуацыі. Цікава, што ў той самы дзень у названую арганізацыю з запытам звярнулася Германія. У сувязі з вышэйзгаданымі абставінамі 25 красавіка 1943 г. адбыўся разрыў савецка-польскіх дыпламатычных адносін [3, с. 40; 4, с. 250–251].

У плане выканання пастановы V Пленума ЦК КП(б)Б (26–28 лютага 1943 г.) да канца першага паўгоддзя 1943 г. былі заўважна ўмацаваны падпольныя партыйныя органы КП(б)Б і партызанскія фарміраванні на тэрыторыі заходніх абласцей, у тым ліку Баранавіцкай і Вілейскай, дзе была значнай канцэнтрацыя польскіх антысавецкіх падпольных структур і разгарнулася работа па стварэнні «лясных атрадаў» Арміі Краёвай (АК).

У перыяд з сакавіка па чэрвень 1943 г. на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці колькасць атрадаў павялічылася з 31 да 48, былі створаны дзве новыя брыгады. У сакавіку 1943 г. распачаў сваю работу Баранавіцкі падпольны абкам КП(б)Б, а ў красавіку арганізавалася абласное партызанскае злучэнне [8, с. 58, 60; 9, с. 25–26]. На тэрыторыі Вілейскай вобласці колькасць атрадаў за гэты час павялічылася з 24 да 33, а брыгад – з 4 да 6. У канцы мая 1943 г. разгарнуў сваю работу Вілейскі падпольны абкам КП(б)Б, які ў ліпені – жніўні 1943 г. стварыў абласное партызанскае злучэнне [8, с. 122, 124; 9, с. 163–165].

Небяспека таго, што ініцыятыва ў барацьбе з нямецкімі акупантамі пяройдзе адназначна да савецкіх партызан, а таксама ўключэнне ў іх структуры палякаў прывяло да таго, што ў першай палове 1943 г. Галоўнае камандаванне АК па ўзгадненні з Лонданскім эміграцыйным урадам стала арганізоўваць атрады з апорай на існуючую канспіратыўную сетку. За перыяд вясна – лета 1943 г. у Навагрудскай акрузе АК узніклі восем атрадаў, у тым ліку пад № 301, 311, 312, 314, 321 і 322. Найбольш вядомае з падраздзяленняў АК – атрад пад камандаваннем К. Мілашэўскага ў Стаўбцоўскім раёне Баранавіцкай вобласці [4, с. 216–217; 10, с. 41–42].

З наступленнем вясны 1943 г. таксама разгарнулі падрыхтоўку сваіх членаў для ўзброенай барацьбы структуры Віленскай акругі АК. Баявы збор першага атрада Маладзечанскага раёна адбыўся яшчэ ў пачатку лета 1943 г. у колькасным складзе 15 чалавек у лясным масіве каля населенага пункта Гарадок. У пачатку лета 1943 г. на тэрыторыі Вілейскай вобласці ў раёне возера Нарач дзейнічаў даволі буйны атрад на чале з А. Бужынскім («Кміціц») [4, с. 258; 11, с. 145].

Створаныя падраздзяленні «акаўцаў» сталі падпарадкоўвацца кіруючаму цэнтру ў Галоўным камандаванні АК. З мэтай кантролю над атрадамі Галоўнае камандаванне АК накіроўвала на месцы сваіх прадстаўнікоў (эмісараў) з Вільні і Варшавы, якія затым станавіліся на чале «акаўскіх» баявых структур.

Актывізацыя дзейнасці Лонданскага эміграннцкага ўрада ў напрамку стварэння партызанскіх атрадаў АК, мабілізацыйныя мерапрыемствы польскага антысавецкага падполля на тэрыторыі заходніх абласцей, захады па забеспячэнні зброяй «лясных атрадаў», у тым ліку шляхам дастаўкі з Віленскага і Варшаўскага цэнтраў, не засталіся па-за ўвагай падпольных партыйных органаў і партызанскага камандавання. Акрамя таго, вясной – напачатку лета 1943 г. адбылося больш за 10 узброеных сутыкненняў паміж савецкімі партызанамі і падраздзяленнямі АК, у выніку якіх загінулі дзясяткі байцоў з абодвух бакоў. Безумоўна, першаснае значэнне меў палітычны аспект – Лонданскі эміграцкі ўрад, польскае антысавецкае падполле на месцах, кіраўніцтва структур АК настойліва заяўлялі, што заходнія вобласці Беларусі – гэта тэрыторыя Польскай дзяржавы [12, с. 282; 13, с. 146–147].

З улікам ваенна-палітычнай сітуацыі, якая склалася ў першай палове 1943 г., ЦК КП(б)Б прыняў праграмныя дакументы па дзейнасці партыйных падпольных органаў КП(б)Б і партызанскага камандавання адносна польскага антысавецкага падполля, у тым ліку структур АК. Гэта пастанова ад 22 чэрвеня 1943 г. «О мерах по дальнейшему развертыванию партизанского движения в западных областях Белоруссии», а таксама закрыты ліст «О военно-политических задачах работы в западных областях БССР», падпі-саны П. К. Панамарэнкам 2 жніўня 1943 г. Тэкст ліста змешчаны ў дырэк-тыве ЦК КП(б)Б №240 с ад 31 ліпеня 1943 г.) [14, л. 2–6].

У дакуменце змешчаны важнейшы палітычны тэзіс –заходнія вобласці Савецкай Беларусі з'яўляюцца неад'емнай часткай Беларускай савецкай сацыялістычнай дзяржавы (так у дакуменце), неад'емнай тэрыторыяй СССР і на такой аснове неабходна развіваць барацьбу [14, л. 3аб].

Далей у лісце адзначана, што польскі ўрад разглядае заходнія вобласці Савецкай Беларусі... як частку Польшы і ў адпаведнасці з гэтым будуе сваю міжнародную палітыку і адносіны да СССР. Для рэалізацыі такіх мэтаў спрабуе стварыць у рэгіёне шырокую сетку «националистических организаций, вооруженных отрядов, насаждает свою агентуру и подпольные центры, засылает эмиссаров», каб назапасіць сілы і ў зручны момант быць гатовымі ваенным шляхам ажыццявіць свае намеры [14, л. 4].

Пры аналізе стану польскага падполля ўказана, што створаны некаторыя рэзервы і падпольныя арганізацыі ў вёсках і гарадах, а ў некаторых месцах арганізаваны схаваныя групы самаабароны, свае атрады, а таксама ў некаторых месцах нават палкі [14, л. 4].

Адносна пазіцыі кіраўнікоў польскага падполля на месцах у дакуменце ўказана, што яны імкнуцца ўтрымаць народ ад актыўных выступленняў супраць немцаў. Падчас перамоваў з падпольнымі партыйнымі арганізацыямі і атрадамі іх прадстаўнікі выказваюць патрабаванні прызнаць незалежнасць сфарміраваных імі атрадаў АК, а раёны іх мяркуемых дзеянняў разглядаць як польскую тэрыторыю, на якой пры сумесных дзеяннях савецкія партызаны павінны падпарадкоўвацца польскаму партызанскаму штабу «Усход» [14, л. 4]. Напрыклад, такія патрабаванні выказваліся прадстаўнікамі штаба «Усход» у чэрвені 1943 г. пры перамовах з камандаваннем брыгады імя В. І. Леніна Баранавіцкай вобласці [15, л. 32, 33–40].

Сярод тактычных прыёмаў польскага падполля ў лісце названы разведка сіл савецкіх партызан, сеткі партыйных падпольных цэнтраў, партызанскіх атрадаў, кіруючых кадраў партызанскага руху. Заўважана, што польскае падполле імкнецца да часу пазбягаць адкрытых сутыкненняў з савецкімі партызанамі, назапашвае сілы для будучых адкрытых атак на партызан [14, л. 4].

У якасці арганізацыйных мер барацьбы з польскім антысавецкім падполлем было прапанавана ўжо створаныя польскія атрады настойліва выцясняць шляхам арганізацыі новых савецкіх падраздзяленняў, засылаць у польскія атрады сваю агентуру, выяўляць дзейсных прадстаўнікоў польскіх нацыяналістаў ці нямецкай разведкі, пры неабходнасці, зыходзячы з канкрэтнай сітуацыі, ствараць атрады, якія ў большасці сваёй будуць камплектавацца палякамі. Вельмі паказальным было патрабаванне наконт таго, што там, дзе ёсць уплыў савецкіх атрадаў і падпольных цэнтраў, дзейнасці польскіх антысавецкіх груп не дапускаць, кіраўнікоў «незаметным образом устранять». Самі атрады і групы ці распускаць, а базы зброі забіраць, ці браць пры магчымасці пад свой надзейны ўплыў, скіроўваць на актыўную барацьбу з немцамі. Пры гэтым такія атрады павінны быць рэарганізаваны і перамешчаны, пазбаўлены сваёй самастойнасці як баявой адзінкі, далучаны да савецкіх атрадаў. Абавязковая ўмова – чыстка ад варожых элементаў [14, л. 5аб–6].

У адпаведнасці з патрабаваннямі закрытага ліста ў Вілейскай вобласці з дазволу П. К. Панамарэнкі брыгада імя К. Я. Варашылава на чале з Ф. Р. Маркавым 26 жніўня 1943 г. каля возера Нарач правяла буйную аперацыю па раззбраенні брыгады падхарунжага А. Бужынскага («Кміціца»). У выніку 80 легіянераў разам з А. Бужынскім былі расстраляны. З ліку раззброеных «акаўцаў» быў створаны савецкі польскі атрад на чале з У. Мрачкоўскім колькасцю 120 чалавек. Спачатку падраздзяленне было ў брыгадзе імя Г. К. Жукава, а затым у брыгадзе імя імя К. Я. Варашылава. Аднак у вельмі хуткім часе атрад перастаў існаваць з-за дэзерцірства значнай часткі байцоў [1, л. 3, с. 66–72; 4, с. 256; 16, л. 141, 142].

Больш маштабнай аперацыяй супраць «акаўцаў» было раззбраенне савецкімі партызанамі атрада АК у Стаўбцоўскім раёне. Неабходна адзначыць, што на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці ў перыяд з чэрвеня да снежня 1943 г. адбылася найбольшая колькасць узброеных канфліктаў паміж беларускімі партызанамі і баявымі групамі польскага антысавецкага падполля – 30 баёў і сутычак, падчас якіх былі ахвяры з абодвух бакоў.

Пэўны час атрад АК пад камандаваннем К. Мілашэўскага падтрымліваў кантакты з беларускімі партызанамі: узаемадзейнічаў пры нападзенні на гарнізон у Івянцы і падчас адбіцця гітлераўскай карнай аперацыі «Герман» (1.07–11.08.1943). Узаемаадносіны пачалі рэзка пагаршацца з кастрычніка 1943 г. у сувязі з прыбыццём у месца дыслакацыі атрада ваеннаслужачых былой польскай арміі з Віленскага і Варшаўскага цэнтраў. Усе яны прайшлі спецыяльную ваенную падрыхтоўку і мелі навыкі правядзення дыверсій. Першым прабраўся з Віленскага цэнтра паручнік А. Пільх з групай 14 чалавек. Адразу па прыбыцці ён фактычна стаў камандаваць падраздзяленнем АК

Стаўбцоўскага раёна. Яшчэ адна група колькасцю 7 чалавек прыбыла з Варшавы. Атрад быў рэарганізаваны і загадам камандуючага Навагрудскай акругі АК стаў лічыцца 1-м батальёнам 76-га пяхотнага палка АК. Спачатку камандзірам батальёна стаў паручнік З. Кахутніцкі, а затым маёр В. Пелка, якія прыбылі з Варшавы. Астатнія ваеннаслужачыя, засланыя ў падраздзяленне, занялі камандныя і штабныя пасады, арганізавалі агітацыйную працу, пачалі падрыхтоўку да разгортвання яшчэ аднаго батальёна АК [3, с. 78–82; 4, с. 258; 17, л. 212–213, 241].

Пасля прыбыцця эмісараў з Варшавы паміж савецкімі партызанамі і «акаўцамі» на працягу кароткага часу адбылося некалькі ўзброеных сутычак. 5 лістапада 1943 г. у вёсцы Куль Івянецкага раёна быў забіты партызан брыгады імя М. В. Фрунзе Шчэрбін; 8 лістапада разведчыкі брыгады імя В. П. Чкалава Рагазінскі і Варапай былі закатаваныя каля в. Хотава Івянецкага раёна групай жандармаў на чале з начальнікам жандармерыі атрада Гасюком. 17 лістапада ў в. Дубнікі Стаўбцоўскага раёна групай Нуркевіча верскі знішчаны 10 партызан атрада № 106. Улічваючы такі ход падзей, Баранавіцкі падпольны абкам КП(б)Б і Івянецкі падпольны райкам КП(б)Б правялі спецыяльнае расследаванне, па выніках якога з дазволу начальніка ЦШПР было прынята рашэнне аб прымусовым расфарміраванні польскага батальёна [3, с. 84–85; 4, с. 259; 10, с. 147; 17, л. 209, 213–214, 218].

У выніку праведзенай аперацыі 1 снежня 1943 г. у раёне Прудзішча – Дрывезна брыгады імя І. В. Сталіна і М. В. Фрунзе акружылі лагер Стаўбцоўскага батальёна АК і раззброілі яго байцоў. Пасля раззбраення большасць радавых байцоў была накіравана ў беларускія партызанскія фарміраванні – атрады імя М. В. Фрунзе, А. В. Суворава, М. А. Шчорса, В. П. Чкалава, «Бальшавік». Афіцэраў і кіраўнікоў батальёна АК арыштавалі, абвінавацілі ў справе АК і сурова пакаралі – адных расстралялі, а другіх пераправілі ў Маскву [3, с. 86–87; 4, с. 259;10, с. 149; 11, с. 162; 17, л. 214].

У межах цяперашняй тэрыторыі Беларусі найбольш шматлікае польскае антысавецкае падполле, у тым ліку адзінкі АК, было ў Баранавіцкай і Вілейскай абласцях. Працэс стрымлівання арганізацыі і функцыянавання структур АК у названым рэгіёне ўключаў у сябе збор, аналіз, абагульненне і перадачу ў Цэнтр разнастайнай інфармацыі аб ваенна-палітычнай сітуацыі ў раёнах Заходняй Беларусі, прыняцце рашэнняў і іх рэалізацыю. На падставе гэтага ў другой палове 1943 г. былі раззброены і перасталі існаваць два буйныя падраздзяленні АК у Баранавіцкай і Вілейскай абласцях, чым, безумоўна, быў нанесены моцны ўдар па сетцы польскага антысавецкага падполля ў рэгіёне.

## ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далее – НАРБ). – Фонд 1450. Воп. 4. Спр. 68.

2. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 76.

3. *Благов, С. В.* «Чужие среди своих». Польское население в советском партизанском движении на территории Белорусской ССР. 1941–1944 / С. В. Благов. – М. : Центрполиграф, 2024. – 223 с.

4. Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939–1953) : монография / С. А. Ситкевич, С. А. Сильванович, В. В. Барабаш, Н. А. Рыбак. – Гродно : ГГАУ, 2004. – 345 с.

5. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / Л. Аржаева [и др.] ; редкол.: А. Т. Кузьмин [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983–1985. – Т. 2 / Л. В. Аржаева [и др.] ; редкол.: А. А. Филимонов [и др.]. – 1984. – 551 с.

6. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 20, спр. 214.

7. *Кнацько, Г. Д.* Главное дело (вклад союза польских патриотов в СССР в создание демократической Польши) / Г. Д. Кнацько. – Минск, 1988. – 25 с.

8. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыкл. / Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1990. – 680 с.

9. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : краткие сведения об орг. структуре партиз. соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / А. Л. Манаенков [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – 765 с.

10. *Барадзін, З.* Нёман – рака нязгоды / З. Барадзін. – СПб. : Невский Простор, 2018. – 333 с.

11. *Сямашка, Я. І.* Армія Краёва на Беларусі / Я. І. Сямашка. – Мінск : «Хата», 1994. – 270 с.

12. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А. А. Каваленя, А. М. Литвин [и др.]. – Минск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.

13. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. : в 2 кн. – Минск : Беларус. навука, 2014. – Кн. 2. – 335 с.

14. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 397.

15. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 305.

16. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 88.

17. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 2. Спр. 50.